**Сутула, Г.** Нізка галовы схіляем перад кожным салдатам Афгана / Г. Сутула // Веснік Глыбоччыны. — 2022. — 12 лют. — С. 4.

# НІЗКА ГАЛОВЫ СХІЛЯЕМ ПЕРАД КОЖНЫМ САЛДАТАМ АФГАНА

**Род Патапенкаў з вёскі Завулак-Рускі – гэта тры пакаленні мужчын-абаронцаў, якія кожны ў свой час добрасумленна служылі Радзіме. Яны не лічылі геройствам ваяваць на фронце і ў гарачых кропках, рызыкаваць жыццём, выконваючы воінскі абавязак. Менавіта такім, адказным, дасцыплінаваным і адважным, краіна давярала свае межы і спакой.**



**Павел Патапенка дзеліцца ўспамінамі пра вайну ў Афганістане**

Павел Патапенка – салдат у другім пакаленні. Яго бацька Пётр Дзянісавіч ваяваў на франтах  Вялікай Айчыннай вайны. За адвагу і мужнасць быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай зоркі і многімі медалямі. У сям'і Пятра Патапенкі падрасталі двое сыноў, але доўга парадавацца імі бацьку не давялося.

Мне было гадоў адзінаццаць, брату крыху больш, калі не стала таты і мамы. Іх нам замяніла бабуля Фёкла. Шкадавала яна нас, сірот, клапацілася, у школу адпраўляла, з арміі чакала, хвалявалася і перажывала, – успамінае Павел Пятровіч. – Пасля васьмігодкі ў Завулках я скончыў сярэднюю школу ў Кублічах Ушацкага раёна. Там нас, старшакласнікаў, паралельна са школьнымі прадметамі на занятках у вучэбна-вытворчым камбінаце вучылі рабочым прафесіям. Разам з атэстатам аб заканчэнні школы мы атрымалі і пуцёўку ў рабочае жыццё. Маё пачалося ў саўгасе «Івесь», дзе я працаваў электрыкам. Пакуль у Маскве служыў старэйшы брат, мне давалі адтэрміноўку ад арміі, бо трэба было дапамагаць састарэлай бабулі.

70–80-ыя гады былі для Савецкага Саюза неспакойным часам: ішла Афганская вайна. Чуткі пра яе даходзілі і да беларускай вёсачкі Завулак-Рускі, але вяскоўцы жылі сваім прызвычаеным жыццём і думалі, што ваенныя падзеі адбываюцца далёка і іх не закрануць. Думаць інакш пачалі, калі ў вёску прыляцела першая пахаванка, а за ёй прывезлі цынкавую труну.

З Сашам Чаронкам мы равеснікі, разам вучыліся ў школе, жылі па суседстве, гулялі разам. Яго прызвалі ў армію ў 1983 годзе. Адтуль ён пісаў малодшаму брату пісьмы, у якіх расказваў пра свае мары, пра тое, як вернецца, пойдзе вучыцца ў мараходнае вучылішча. А праз год Сашы не стала, ён загінуў у Афганістане. Вярнуўся на радзіму ў «Чорным цюльпане» і «цынкавым бушлаце» – так пазней спявалі ў песнях. Гора пасялілася праз вуліцу, і калі прызвалі ў армію мяне, яно чорным ценем следавала ў думках, – расказвае Павел Пятровіч. – Але што толку: бойся не бойся, а свайго лёсу не мінеш. Ужо ў Барысаве, дзе навабранцы чакалі «купцоў» з ваенных часцей, я ведаў, што траплю ў Афганістан...

Вясна 1987 года выдалася халодная, целагрэйка на плячах лішняй не была, а як прыляцелі з Мінска ў Ташкент – у майцы душна стала. Ад Ташкента да Тэрмеза суткі дабіраліся цягніком. Вакол пяскі, стэп, горы на гарызонце і спёка. У Тэрмезе я праходзіў вучэбку, там жа ў ліпені прымаў прысягу. У вучэбным палку былі дзве тысячы салдат: танкісты, пехацінцы, разведчыкі, артылерысты і тры ўзводы нас, зенітчыкаў, якія служылі ў войсках супрацьпаветранай абароны. Усё ў нас было: фізпадрыхтоўка, страявая, вучылі Статут, у нарады хадзілі. Атрымаў я спецыяльнасць аператара зенітных установак і ў кастрычніку 1987 года трапіў у Афганістан.

Радавы Павел Патапенка служыў у зенітным палку, які базіраваўся ў афганскім Ташкургане ў правінцыі Саманган. Полк трымаў пад кантролем дарогу, якая звязвала ўзбекскі Тэрмез з афганскім Кундузам і па якой ішло ваеннае, тэхнічнае, медыцынскае і харчовае забеспячэнне савецкіх войск.



**Павел Патапенка прымае ваенную прысягу**

– Я служыў на адной з застаў, якая ахоўвала месца базіравання палка. Было нас там 30 чалавек з розных родаў войск, БТРы, кулямёты. Мы заступалі на дзяжурствы, правяралі блокпасты.

Непадалёк размяшчаліся мясцовыя кішлакі, куды ноччу прыходзілі маджахеды. Напачатку страшна было, калі ў цемені пры нулявой бачнасці пачыналася перастрэлка. Але да ўсяго прывыкаеш: з цягам часу пасля дзяжурстваў я засынаў і пад кулямётныя чэргі. Не раз маджахеды бралі ў палон нашых ваеннаслужачых. Падпаўзалі да пазіцый, мяшок на галаву і раствараліся ў ночы. Пасля мы выручалі сваіх, абменьваючы на палонных афганцаў: за аднаго нашага аддавалі па дваццаць пяць іхніх, бо той, хто пабываў на вайне, ведаў кошт братэрства і ўдвая цаніў жыццё, якое тут магло абарвацца ў любы момант, – гартае ўспаміны Павел Пятровіч.



**Узвод зенітчыкаў у Тэрмезе. Павел Патапенка першы ў другім радзе**

Сказаў ён і пра гепатыт, які кожную восень не горш за аўтамат «касіў» салдат і ўкладваў іх на бальнічныя ложкі, і аб адносінах мясцовых жыхароў да савецкіх салдат, якіх адны называлі акупантамі, а другія – абаронцамі і міратворцамі. З непрыхаваным жалем гаварыў пра вывад войск з Афганістана. Здавалася б, радавацца трэба, але на дарозе, праверанай сапёрамі, грымелі ўзрывы: на пластыкавых мінах падрываліся людзі і бронетэхніка. Страты пры вывадзе войск з Афганістана перавысілі колькасць загінуўшых за ўсе гады Афганскай вайны – вось такімі трагічнымі былі развітальныя провады воінаў-інтэрнацыяналістаў з чужой зямлі.

Павел Патапенка вярнуўся дадому жывым. З нагрудным знакам і медалём «Воіну-інтэрнацыяналісту». А грамату Вярхоўнага Савета СССР за подпісам М. Гарбачова за добрасумленна выкананы інтэрнацыянальны абавязак яму ўручылі ў Глыбоцкім ваенкамаце. Гэтыя ўзнагароды і праблемы са здароўем, нажытыя на той вайне, – і ёсць памяць салдата.

Ці трэба была тая вайна, якая забрала жыцці больш за пятнаццаць тысяч салдат, зрабіла калекамі сотні маладых хлопцаў, кінула ў невядомасць і запісала ў лік прапаўшых без вестак дзясяткі юнакоў? Адказам на гэтае пытанне могуць быць словы вядомага філосафа: «Калі маўчыць дыпламатыя, гаворыць зброя», – разважае мой суразмоўца. – А нам саромецца нечага, бо з годнасцю выканалі воінскі абавязак. Цяпер жывём у мірнай краіне, нашы дзеці служаць у Беларусі і гэта – шчасце. Мой сын Саша, як і я, служыў у войсках супрацьпаветранай абароны ў Паставах. Мы з жонкай яго часта наведвалі, тэлефанавалі, нагоды для перажыванняў не было. Малодшы Мікіта думаў пайсці ў армію кантрактнікам...

Армія для любога мужчыны, на мой погляд, – гэта выдатная практычная школа. Мяне яна навучыла быць самастойным і дысцыплінаваным, разбірацца ў людзях, цаніць жыццё і быць яму ўдзячным за ўсё, паказала свет і дала неацэнны жыццёвы вопыт. А мая цяперашняя мара, каб жорсткія, незразумелыя войны нідзе і ніколі не паўтараліся, – падвёў рысу сказанаму мой суразмоўца.

**Галіна Сутула**

Фота аўтара і з сямейнага архіва